# ПЛАН-СЦЭНАРЫЙ КВІЗА "ГОРАД МОЙ — СЭРЦА МАЁ ..."

*Маслова Лилия Николаевна*

**Мэта:** фарміраваць пачуццё патрыятызму і актыўную жыццёвую пазіцыю як якасці асобы будучага грамадзяніна.

**Задачы:**

фарміраваць пачуццё гонару за краіну, горад, павагу да яго гістарычнага мінулага;

садзейнічаць развіццю аналітычнага мыслення, памяці;

садзейнічаць развіццю камунікатыўных навыкаў і ўмення працаваць у камандзе.

**Абсталяванне:** прэзентацыя, бланкі для адказаў каманд, відэафайл "Цацачны Віцебск" (дадатак), пратакол для журы.

### Ход мерапрыемства

**I. Уступная частка.**

*Прывітальнае слова вядучага*[1].

На зямлі існуе многа гарадоў, пасёлкаў, весак. На карце свету вы знойдзеце шмат краін унікальных, прыгожых, непаўторных. І толькі адно слова на вялікай карце свету заставіць па-асабліваму хвалявацца, а ў галаве адлюструюцца родныя вобразы. Да болю знаёмыя сцяжынкі, пахі, словы, гукі. Гэта малая радзіма, гэта мілы сэрцу куточак зямлі.

Пімен Панчанка пісаў: "Кожны з нас прыпасае радзімы куток, Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны".

Мы жывём у г. Віцебску. Нават калі вы нарадзіліся ў іншым месцы, наш горад усё роўна для кожнага жыхара з'яўляецца любімым, дарагім. А ці добра мы яго ведаем? Прапануем паспаборнічаць у веданні сваёй малой радзімы.

*Открой, история, страницу,*
*Где Витебск древний, молодой!*
*Княгиней Ольгой ты заложен*
*Над полноводною Двиной!*
*Прекрасен ты в лучах восхода,*
*Неподражаем ты во всём:*
*Мостами, Ратушей, Природой.*
*Гордимся тем, что здесь живем!*

На інтэлектуальнай гульне вас чакаюць:

— 6 цікавых тураў. Кожны з тураў утрымлівае па 7 пытанняў, якія прысвечаны нашай малой радзіме — Віцебску, Віцебскай вобласці. Спачатку я чытаю пытанне, на абдумванне якога даецца каля 30 секунд, потым — наступнае пытанне і г.д. Адказы перадаюцца журы. Агучваюцца правільныя адказы.

— азарт і жаданне перамагчы супернікаў;

— работа з прыемнай кампаніяй;

— шмат пазітыўных эмоцый, якія ператвораць будні дзень у сапраўднае свята.

Раскінем розумам па-беларуску! Раскінем розумам па-віцебску!

*Прывітанне гульцам — дзяўчатам і хлапцам.*
*Жадаю трапных адказаў паасобку і ўсім разам.*
*Вітаю гасцей-гледачоў, што разам з намі зноў.*
*Журы таксама жадаю ўдачы: А як жа іначай?!*

Гульцы гатовыя? А журы? Калі ўсе гатовыя, пачынаем.

**II. Асноўная частка.**

**Тур 1.** <u>Неверагодна, але факт, або Праўда ці Хлусня.</u>

На працягу ўсёй гісторыі ў Віцебску адбывалася столькі самых розных падзей, што часам пачынаеш задумвацца, ці было гэта на самай справе. Адзначце галачкай у адпаведным слупку ліста адказу праўдзівыя і выдуманыя факты.

1. У гэтым горадзе пражывае больш людзей, чым ва ўсёй Ісландыі. *(Так. Віцебск — амаль 378 тысяч, Ісландыя — крыху больш 338 тысяч.)*

2. У часы Расійскай імперыі трамваі ў Віцебску з'явіліся раней, чым у Маскве і Санкт-Пецярбурзе. *(Так.)*

3. Пасля з'яўлення на плошчы Тысячагоддзя помніка Аляксандру Неўскаму гарвыканкам вырашыў перайменаваць яе і прысвоіць ёй імя гэтага рускага ваеннага дзеяча. *(Не.)*

4. Па задумцы архітэктараў, Кіраўскі мост, пабудаваны ў 1955 годзе, павінен быў быць разводным, як у Санкт-Пецярбурзе. *(Не.)*

5. Пасля таго, як у 1920 годзе Марк Шагал з'ехаў з Віцебска, ён больш ніколі не быў у родным горадзе. *(Так.)*

6. У музеі "Духаўскі круглік" можна ўбачыць рэшткі былой васьміграннай вартаўніцкай вежы. А сам музей атрымаў такую назву, бо будынак мае круглую форму. *(Не. Духаўскі круглік квадратны. Першапачаткова ён быў прастакутным і зваўся Нарожнай вежай. Аднак у 17 стагоддзі вежу перабудавалі ў форме васьмікутніка. Вельмі проста — непадалёк калісьці размяшчалася царква Святога Духа. Ад яе круглік і атрымаў сваю назву.)*

7. Летам 2015 года, калі Заходняя Дзвіна абмялела, археолагі знайшлі астаткі падземнага хода, які ішоў з-пад Успенскага сабора на правы бераг ракі. *(Не.)*

**Тур 2.** <u>Ёсць вуліцы цэнтральныя...</u>

Вам неабходна выбраць адзін з варыянтаў адказаў (правільныя адказы вылучаны паўтлустым шрыфтам).

1.Віцебск адрозніваецца тым, што ў ім шмат вуліц маюць нумар. Якая з іх самая «нумарная»?

*А) Лучоская, **б)** Гарадоцкая, в) Стадыённая, г) Пралетарская.*

2. У гонар каго названа вуліца Крылова?

*А) У гонар байкапісца Івана Крылова, **б)** у гонар Сямёна Крылова — рэвалюцыянера, удзельніка ўстанаўлення савецкай улады на Віцебшчыне, в) у гонар расійскага спевака Сяргея Крылова.*

[1]Здесь и далее приводятся слова ведущего.

3. Якая з гэтых вуліц раней называлася Бязбожная?

*А) Вуліца Пралетарская, б)вуліца Леніна, в) вуліца Чырвонага Партызана,* ***г)*** *вуліца Шубіна.*

4. У якім раёне Віцебска знаходзіцца вуліца Шчаслівая?

*А) Білева, б) Журжава,* ***в)*** *Тулава, г) Маркаўшчына.*

5. Якой з гэтых вуліц няма на карце Віцебска?

*А) Вуліцы Сярова, б) вуліцы Малевіча,* ***в)*** *вуліцы Хруцкага, г) вуліцы Рэпіна.*

6. Такія прадметы асабістай гігіены, як зубная шчотка, калісьці выпускалі на Віцебскім шчацінна-шчотачным і валасапрадзільным камбінаце імя В.Куйбышава. На якой вуліцы да вайны знаходзілася гэта прадпрыемства?

*А) На вуліцы Замкавай, б) на вуліцы Інжынернай,* ***в)*** *на вуліцы Талстога.*

7. Вуліца з якой назвай існуе на карце Віцебска?

*А) Залатая, б) Срэбраная, в) Бронзавая,* ***г)*** *Алмазная.*

**Тур 3.** <u>«Мне выпала шчасце тут нарадзіцца… »</u>

*Мне выпала шчасце тут нарадзіцца,*
*Мне выпала шчасце жыццё тут спазнаць,*
*Да светлай крыніцы жыцця прычасціцца*
*І краю свайго прыгажосць адчуваць.*

Так пра сябе могуць сказаць не толькі прысутнічыя гульцы, але і шмат знакамітых людзей, якія праславілі нашу Віцебшчыну сваімі дасягненнямі, адкрыццямі, творчасцю.

*1.* «Я безгранично люблю свой родной Витебск, — прызнаваўся мастак. — Не просто потому, что я там родился, но и, прежде всего, за то, что там я на всю жизнь обрел краску своего искусства…». Каму належаць гэтыя словы? *(М. Шагал.)*

*2.* Горад Віцебск і касмічную станцыю «Мір» звязвае вынаходніцтва, зробленае гэтым расійскім вучоным. З вынаходніцтвам яго мы сутыкаемся паўсядзённа. Работа кампакт-дыскаў і дысказводаў не была б магчыма без лазернага прыбора яго імя. *(Нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў. Сонечныя батарэі, вынайдзеныя фізікам Ж.Алфёровым, які нарадзіўся ў г.Віцебску, 15 гадоў забяспечвалі касмічную станцыю "Мір" энергіяй.)*

*3.* Месцам нараджэння гэтай асобы з'яўляецца маёнтак Палібіна Віцебскай губерніі. Цікавасць да навукі прымусіла заключыць з маладым вучоным фіктыўны шлюб, які перарос у сапраўднае каханне. *(Соф'я Кавалеўская. Дзеля таго, каб атрымаць вышэйшую адукацыю ва ўніверсітэце за мяжой, выйшла замуж, бо муж дазволіў ей пакінуць краіну.)*

*4.* Нарадзіўся ён у 1914 годзе ў вёсцы Міхалкова. Да вайны працаваў настаунікам. У гады Вялікай Айчыннай вайны стаў адным з арганізатараў партызанскага руху на Віцебшчыне і няшчадна змагаўся з фашыстамі, за што практычна усе яго родныя (а гэта 14 чалавек) былі забітыя ворагам. *(Даніла Фядотавіч Райцаў.)*

*5.* Выдатны стваральнік савецкіх самалётаў Су нарадзіўся ў г. Глыбокае на Віцебшчыне. Хто гэта? *(Павел Осіпавіч Сухі).*

*6.* У кожнага мастака свая Мадона. А ў гэтага — Партызанская. Дакументальная стужка аб ім называлася «Апаленая памяць», таму што дваццацігадовым змагаўся з фашыстамі ў Чырвонай Арміі, цудам выжыў у концлагеры, удзельнічаў у вызваленні Севастопаля. *(Міхаіл Савіцкі, аўтар каля 200 карцін, нарадзіўся ў вёсцы Звянячы Віцебскай вобласці.)*

*7.* Нарадзіўся ён у вёсцы Касцюкі Віцебскага раёна. Ён сустракаўся с Прэзідэнтам ЗША, танцаваў на балі ў англійскай каралевы, піў гарбату з канцлерам Германіі, быў на афіцыйным прыёме ў Папы Рымскага. І гэтых почасцей ён удастоены не за адкрыцці і вынаходніцтва, а дзякуючы сваім асаблівасцям. *(Фёдар Махноў — віцебскі велікан.)*

**Тур 4.** <u>Маўклівыя сведкі мінуўшчыны.</u>

Калі вы думаеце, што ведаеце пра віцебскія помнікі ўсё, мы прапануем вам наступны тур. *(Так.)* Віцебшчына поўная незвычайных і слаўных месцаў, ад самых дзіўных і непрыкметных да тых, што становяцца прадметам гарачых абмеркаванняў. Галоўнае, чым варта ўзброіцца ў гэтым нялёгкім выпрабаванні, — веды і ўважлівасць. Бо часам мы так прызвычайваемся да некаторых выдатных мясцін, што зусім перастаем звяртаць на іх увагу!

1. У якім горадзе Віцебскай вобласці знаходзіцца помнік барону Мюнхгаўзену? *(Глыбокае. Тут былі знойдзены могілкі, дзе на крыжы па-нямецку напісана "Фердзінанд і Вільгельміна фон Мюнхгаўзен".)*

2. У якім горадзе нашай вобласці ў 1991 годзе ўстаноўлены адзіны ў Еўропе помнік ненароджанаму дзіцяці? *(Міёры. Унікальны помнік стварыў беларускі скульптар Аляксандр Дранец.)*

3. У якім горадзе знаходзіцца помнік новаму беларускаму турыстычнаму брэнду — Цмоку? Цмок — беларуская змеепадобная істота, пра якую расказвае Уладзімір Караткевіч у рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». *(Лепель. Так назвалі нават баскетбольную каманду «Цмокі», якая ў 2013 годзе стала чэмпіёнам страны.)*

4. Каму прысвечаны помнік, які мае назву «Віцебская мелодыя на французскай скрыпцы»? *(Марку Шагалу).*

5. Гэта мужная жанчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны была сувязной у партызанскім атрадзе пад камандаваннем Васіля Каржа. Па выніках няўдалай аперацыі злоўлена немцамі пад Віцебскам і пасля нечалавечых катаванняў пакарана ў лістападзе 1942 года. Дарэчы, помнік ей знаходзіцца побач з установай адукацыі, якая носіць яе імя. *(Вера Харужая.)*

6. Мемарыяльная дошка гэтаму народнаму пісьменніку Беларусі размешчана ў горадзе Віцебску на будынку дзіцячай мастацкай школы. Раней у гэтым будынку знаходзілася мастацкае вучылішча, дзе на скульптурным аддзяленні і навучаўся будучы пісьменнік у 1939−1940 гадах. *(В.Быкаў.)*

7. Як называцца помнік архітэктуры класіцызму другой паловы XVIII — пачатку XII стагоддзяў, пабудаваны на высокім беразе Заходняй Дзвіны як гарадскі асабняк. Згадаем, што у 1812 г. французскі імператар Напалеон адзначыў у гэтым будынку свой дзень нараджэння. *(Губернатарскі палац.)*

**Тур 5.** Відэатур.

Віцебск — горад-скрыжаванне. Гэтым абумоўлена ўся яго гісторыя. Хто толькі не спыняўся тут? Вялікія людзі ўсіх эпох і часоў — ад княгіні Вольгі да Марка Шагала — мелі дачыненне да паўночнай сталіцы Беларусі. Даўней горад стаяў на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, цяпер гэта культурнае скрыжаванне, дзе кожны год у ліпені сутыкаюцца таленавітыя маладыя людзі. Кожны з якіх пакідае ў Віцебску часцінку сябе і свайго сэрца.

*Прагляд відэасюжэта.*

Пасля прагляду відэасюжэта адкажыце, калі ласка, на пытанні.

1. Усім вядома, што Рым стаіць на сямі халмах. А на якой колькасці гор стаіць Віцебск? *(Віцебск стаіць на сямі гарах — Замкавая, Успенская, Духаўская, Плоская, Вострыя могілкі, Кстоўская и Юр'ева.)*

2. У 1866 годзе у Віцебску быў пабудаваны прыгожы трохпавярховы вакзал. У гэтым жа годзе 5 кастрычніка ў Віцебск прыйшоў першы цягнік. З якога горада? *(Першы цягнік ў Віцебск прыйшоў з Полоцка.)*

3. Горад адзіны з'яўляецца ўладальнікам грашовай адзінкі, якая ходзіць у абароце толькі тыдзень ліпеня. Як называецца грашовая адзінка? *("Васильки" — грашовыя адзінкі, якія ўведзены падчас фестывалю. Імі можна разлічыцца ў пунктах грамадскага харчавання.)*

4. Гэты пісьменнік так сказаў пра Віцебск: "Город древний и нерусский..."? *(І. Бунін.)*

5. «Жыхары горада лічылі, што скляпенні маста па сваёй канструкцыі вельмі падобныя на Эйфелеву вежу. Таму хадзілі чуткі аб тым, што іх ўзводзілі адны і тыя ж будаўнікі. На жаль, гэта ўсяго толькі гарадская легенда». Пра які масту ідзе гаворка? *(Кіраўскі мост.)*

6. У нашым горадзе іх вядома два. Адзін на карце горада з'яўляецца перыядычна, а вось другі, старэйшы за першы, вядомы далёка за межамі горада. І першы, і другі атрымалі сваю назву з-за колеру. Як першы, так і другі бачылі многае на сваім стагоддзі і не жадае ісці на кампрамісы, з якімі б там ні было ансамблямі. Назавіце абодвух. *(«Сіні дом» — будынак на вуліцы Леніна і аднайменная карціна Марка Шагала.)*

7. Віцебск, быццам бы блакітныя артэрыі, сілкуюць тры ракі — Заходняя Дзвіна, Лучоса, Віцьба. Часткі горада, раздзеленыя рэкамі, злучаюць масты. Колькі іх налічваецца ў Віцебску? *(У Віцебку налічваецца 20 мастоў і мосцікаў, акрамя чыгуначных і пуцеправодаў, а 11 з іх — пешаходныя.)*

**Тур 6.** Самая, самае, самыя...

1. Назавіце вуліцу Віцебска, якая з'яўляецца рэкардсменкай па колькасці люкаў на ёй. *(Вуліца Суворава, якая з'яўляецца пешай, дзе на 1300 метраў было больш 100 люкаў.)*

2. Назавіце самы маленькі горад не толькі Віцебскай вобласці, але і усёй Беларусі. *(Дзісна.)*

3. Назавіце самую доўгую вуліцу Віцебска. *(Вуліца Ленінградская, яе працяглацсь складае 7,3 км.)*

4. Назавіце самы працяглы маршрут аўтобуса *(Самы працяглы маршрут у аўтобуса № 26а — 32,75 кіламетры).*

5. Назавіце самую маленькую вуліцу — працягласцю 80 метраў, з 4 дамамі на ёй. *(Вуліца Маякоўскага.)*

6. Назавіце самы стары від гарадскога транспарта ў Віцебску. *(Трамвай.)*

7. Назавіце самы стары з захаваўшыхся помнікаў у Віцебску. *(Помнік героям 1812 года).*

Помніку больш за 100 гадоў, калісьці сродкі на яго ўстаноўку ахвяравалі жыхары Віцебскай губерніі, а адным з ахвяравальнікаў стаў Петр Сталыпін.

**III. Заключная частка.**

Давід Сімановіч, беларускі паэт, празаік, эсэіст, літаратуразнаўца, перакладчык, член Саюза беларускіх пісьменнікаў, пісаў: «У городов, как у людей, черты особые, приметы. И кистью яркою своей века рисуют их портреты. Идут века, плывут века навстречу вьюгам, ветру, зною. И, как седые облака, века проходят над Двиною».

Больш за 85 год налічвае біяграфія Віцебскай вобласці. Больш за 85 год стварэння прыгажосці, дабрабыту, поспеху, міру...

*Ты такі ненаглядны —*
*Мой радзімы куточак зямлі.*
*Ты такі ненаглядны —*
*Край, дзе крылы ўзнімаюць буслы,*
*Дзе асколачкам неба*
*Васілёк у мірным полі цвіце*
*І ля кожнай хацінкі*
*Прыгажуня бяроза расце,*
*Край азёраў глыбокіх*
*І чаромхавых белых завей,*
*Ідэалаў высокіх,*
*Працавітых і шчырых людзей.*
*Тут з адкрытай душою*
*Запрашаюць гасцей у свой дом.*
*Тут накормяць, напояць,*
*Абагрэюць сардэчным цяплом.*

## Список литературы


1. А Вы знали? 10 интересных фактов о Витебске // Централизованная библиотечная система города Витебска: [сайт]. — URL: https://cbsvit.by/index.php/arkhiv-novostej/66-1/8/gorodskie-istorii/5552-a-vy-znali-10-interesnykh-faktov-o-vitebske (дата обращения: 10.01.2026).
2. Витебский городской портал: [сайт] — URL: https://gorodvitebsk.by/ (дата обращения: 10.01.2026).
3. Достопримечательности Витебской области // Belarus.by: официальный сайт Республики Беларусь. — URL: https://www.belarus.by/ru/travel/belarus-life/sightseeing/tourist-attraction-vitebsk (дата обращения: 16.01.2026).
4. Духовской круглик // Центр культуры «Витебск»: [сайт]. — URL: https://gck.by/filialy/dukhovskoi-kruglik (дата обращения: 16.01.2026).

Дадатак

**QR-коды доступа к материалам**

**Презентация**

**Бланки ответов**

**Видеофайл «Витебск игрушечный»**

*Дата поступления в редакцию: 19.01.2026*

# ПРОЕКТ ЛЕТНЕЙ ОЗДОРОВИТЕЛЬНОЙ СМЕНЫ КАК ИНСТРУМЕНТ ЭКОЛОГИЧЕСКОГО И КРАЕВЕДЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ ДЕТЕЙ МЛАДШЕГО И СРЕДНЕГО ШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА В РАМКАХ ГОДА БЛАГОУСТРОЙСТВА И ПЯТИЛЕТКИ КАЧЕСТВА

*Шашкова Наталья Николаевна*

***Аннотация.*** *В статье представлен опыт работы по созданию и реализации 18-дневной программы по экологическому и краеведческому воспитанию детей младшего и среднего школьного возраста в рамках Года благоустройства и Пятилетки качества. В основе проекта — практическая деятельность по благоустройству территории оздоровительного лагеря «Изумрудный», участие в экологических акциях, работа органов детского самоуправления и реализация собственных инициатив воспитанников.*

Президент Республики Беларусь А.Г. Лукашенко отмечал, что «Год благоустройства и наведение порядка — это не просто подмести улицы и высадить деревца. Каждый на своем приусадебном участке, если это на селе, да и в городах, должен навести соответствующий порядок… Мы этот год должны прожить достойно, создав нормальные условия для жизни, прежде всего наших детей» [4]. Летний детский лагерь — это место, наполненное радостью, новыми знакомствами и захватывающими приключениями. Для многих это особый период, когда каждый день приносит что-то новое и интересное. В этом месте рождаются крепкие дружбы и создаются воспоминания, которые останутся на всю жизнь. В лагере каждый ребенок может почувствовать себя частью большой и дружной семьи, научиться чему-то новому и проявить свои таланты. Именно такие возможности для каждого ребенка открывает оздоровительный лагерь «Изумрудный» с круглосуточным пребыванием детей.

Значимость летнего периода для оздоровления и воспитания детей, удовлетворения детских интересов и расширения кругозора невозможно переоценить.